**«Калі трэба плаціць «адпускныя?»**

Кожны работнік мае права на працоўны водпуск (арт. 43 Канстытуцыі, ст. 149 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей-ПК)). Парадак прадастаўлення адпачынкаў устаноўлены ў главе 12 ПК. Аднак на практыцы наймальнікі не заўсёды яго выконваюць. Адным з самых часта задаваемых пытанняў грамадзян, якія звярнуліся на прыём у Смаргонскі міжраённы аддзел Гродзенскага абласнога ўпраўлення Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы з'яўляецца выплата сярэдняга заробку за час працоўнага водпуску.

Наймальнік павінен выплаціць работніку сярэдні заробак за ўвесь перыяд працоўнага адпачынку. Гэта неабходна зрабіць не пазней чым за 2 дні да пачатку адпачынку, а якія працуюць па кантракце - не пазней чым за 1 дзень, калі іншы (больш ранні) тэрмін не ўстаноўлены калектыўным дагаворам арганізацыі (арт. 175, 176 ПК, ч. 4 п. 4 Дакрэта ад 26.07.1999 № 29). Адзначым, што заканадаўства аб працы не ўстанаўлівае мяжу для больш ранняй выплаты сярэдняга заробку за час працоўнага адпачынку. Падлік тэрмінаў для выплаты сярэдняга заробку вызначана арт. 10 ПК.

*Для прыкладу: работнік, які працуе па працоўнаму дагавору, заключанага на нявызначаны тэрмін, збіраецца сысці ў працоўны водпуск 19.08.2019. Апошні дзень, калі наймальнік павінен выплаціць яму сярэдні заробак за час працоўнага адпачынку - 16.08.2019.*

*Першы дзень працоўнага адпачынку працуючага па кантракту - 25.04.2019. Сярэдні заробак за час працоўнага адпачынку наймальнік абавязаны выплаціць яму не пазней за 23.04.2019.*

Вяржынская Таццяна,
галоўны дзяржаўны інспектар
Смаргонскага міжраённага аддзела
Гродзенскага абласнога ўпраўлення
Дэпартамента дзяржаўнай
інспекцыі працы